5. Бірыла М. В., Лемцюгова В. П. Працы па беларускай анамастыцы: Бібліягр. паказ. (1986—1991) і дап. да бібліягр. (1979—1985)// Беларуская анамастыка. Мн., 1992.
6. Васілеўская А. Д., Рамановіч Я. М. Беларускае мовазнаўства: Бібліягр. паказ. (1966—1975). Мн., 1980.
7. Германович И. К., Шуба П. П. Белорусско-русские языковые отношения: Контакты, двуязычие, методика обучения (Материалы к библиогр.)// Русский язык. Мн., 1990. Вып. 10.
8. Давайте чтить традиции предков // Царкоўнае слова. 1994. № 4.
9. Жыдовіч М. А. Бібліяграфічны паказальнік літаратуры па беларускаму мовазнаўству. Мн., 1960.
10. Камароўскі Я. М., Мяцельская Е. С. Беларуская мова: Дапам. для абітурыентаў. 2-е выд., перапрац. і дап. Мн., 1993.
11. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь// Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1994. № 9.
12. Каталог библиографических баз данных по общественным наукам/ ИНИОН АН СССР. М., 1990.
13. Методыка выкладання беларускай мовы: Бібліягр. паказ.: 1969—1990 гг./ Склад. М. С. Лукошус; Рэд. В. У. Прошчанка. Мн., 1993.
14. Наша родная мова: Рэк. бібліягр. спіс. Мн., 1991. (Дадатак да "Новых кніг Беларусі" № 6.)
15. Новая литература по социальным и гуманитарным наукам. Языкознание: Библиогр. указ. / ИНИОН АН РАН. М., 1992. Ежемес.
16. Общее языкознание: Хрестоматия. 2-е изд., перераб. и доп. Мн., 1987.
17. Ожегов С. И. Словарь русского языка. 17-е изд. М., 1985.
18. Плотников Б. Я. Общее языкознание. Семинарий. Мн., 1986.
19. Рубрикатор государственной автоматизированной системы научно-технической информации. 3-е изд. / ВИНИТИ. М., 1984. Т. 1.
20. Супрун А. Е. Лекции по языковедению. Мн., 1978.
21. Сучасная моўная і культурная палітыка Беларусі: Рэф./ Нац. б-ка Беларусі. Склад. К. Ц. Прэнц. Мн., 1993.
22. Универсальная десятичная классификация. Вып. 6: Искусство. Языкознание. География. История/ ВНИИКИ. М., 1986.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**С. В. Зыгмантовіч,**
канд. пед. навук
(Беларус. ун-т культуры),
**В. І. Саітава,**
канд. пед. навук
(Беларус. ун-т культуры)

# СІСТЭМА БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ АБ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАХ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Адным з элементаў інфармацыйнай сістэмы з'яўляецца бібліяграфія бібліяграфіі. Складанне паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў, мяркуючы па публікацыях, выступленнях на канферэнцыях, выклікае вялікую ўвагу прафесіяналаў. У сучаснай інфармацыйнай сітуацыі значэнне бібліяграфіі бібліяграфіі ўзрастае, што звязана с функцыямі,

асаблівасцямі бібліяграфіі бібліяграфіі, якія дазваляюць выкарыстоўваць другасныя крыніцы гэтага віда бібліяграфіі ў розных напрамках дзейнасці бібліятэк.

Мадэлюючая, абагульняючая і прагнозная функцыі бібліяграфіі бібліяграфіі, абгрунтаваныя І. В. Гудаўшчыковай [2], садзейнічаюць таму, што прадукцыя гэтага віду дае магчымасць не толькі знаёміцца з існуючымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі, але і выяўляць "белыя плямы" ў бібліяграфічнай інфармацыі агульнага і галіновага характару, выкарыстоўваць даныя бібліяграфіі бібліяграфіі ў працэсе кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю (пры прагназаванні і планаванні падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў, аналізе вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці). У апошнія гады ўзмацняецца тэндэнцыя да шырэйшага выкарыстання крыніц бібліяграфіі бібліяграфіі пры вырашэнні пошукавых задач. Трэба адзначыць, што ў перспектыве, пры ўкараненні ЭВМ у практыку работы бібліятэк, бягучае інфармаванне, рэтраспектыўны пошук, падрыхтоўка бібліяграфічных выданняў не змогуць весціся ў бібліятэках толькі на базе ўласных рэсурсаў. Неабходнасць узаемадзеяння бібліятэк пры выкарыстанні як рэспубліканскіх, так і замежных бібліяграфічных рэсурсаў у выглядзе баз даных па машыначытаемых носьбітах ці ў рэжыме тэледоступу патрабуе добра наладжанай інфармацыі аб гэтых рэсурсах, з аднаго боку, а з другога — ведання бібліятэкарамі-бібліёграфамі гэтых крыніц інфармацыі, умення правільна іх выбраць, прафесійна з імі працаваць. Ад гэтых фактараў у першую чаргу будзе залежаць эфектыўнасць бібліяграфічнай дзейнасці. Дубліраванне ў падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў, грэбаванне ўжо падрыхтаванымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі, недакладнасць выбару базы даных будуць перашкаджаць эканамічнасці бібліяграфічнага пошуку, адмоўна ўплываць на працу бібліятэк.

Калі разглядаць арганізуючую і рэгулюючую функцыі бібліяграфіі бібліяграфіі, то патрэбна адзначыць, што ў Беларусі значнае развіццё атрымала перспектыўная бібліяграфія бібліяграфіі. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ) як каардынацыйным цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці складаюць і выдаюць перспектыўны план падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў. Ён мае выключнае значэнне для ўпарадкавання працэсу іх падрыхтоўкі і выдання. Акрамя таго, пачынаючы з 1992 г., навукова-бібліяграфічны аддзел НББ штогод выпускае "Тэматычны план выдання бібліяграфічных паказальнікаў бібліятэкамі Беларусі ў ... годзе".

Дзякуючы навукова-бібліяграфічнаму аддзелу НББ складальніцкая дзейнасць бібліятэк стала адным з важных напрамкаў бібліяграфічнай дзейнасці ў рэспубліцы, якая абгрунтавана з навуковага і метадычнага боку. На падставе вывучэння бібліяграфічнай забяспечанасці сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі аддзелам распрацаваны карты — банк даных аб стане бібліяграфічных рэсурсаў. З дапамогай гэтых карт былі вызначаны перспектыўныя напрамкі бібліяграфічнай распрацоўкі новых актуальных тэм, праблем, праграм, што знайшло ўвасабленне ў "Метадычных рэкамендацыях па планаванні падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў у БССР на 1991—1995 гг." і ў каардынацыйным плане на тыя ж гады. Распрацавана таксама мадэль структуры бібліяграфічнай прадукцыі НББ, што садзейнічае ўпарадкаванню падрыхтоўкі крыніц бібліяграфічнай інфармацыі. Плануецца прадоўжыць гэтую работу на міжведамаснай аснове з далучэннем да яе галіновых і абласных каардынацыйных цэнтраў [9]. Матэрыялы аб бібліяграфічнай забяспечанасці беларусазнаўства і асобных відах бібліяграфіі могуць з'явіцца трывалым падмуркам для падрыхтоўкі доўгатэрміновай праграмы развіцця рэспубліканскай сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі.

У Беларусі склалася цэнтральнае звяно сістэмы дапаможнікаў бібліяграфіі бібліяграфіі — рэтраспектыўныя і бягучыя універсальныя (агульныя) бібліяграфічныя дапаможнікі. Функцыянальна-мэтавае іх прызначэнне ў сукупнасці з грамадскім прызначэннем універсальных дапаможнікаў — рэалізацыя камунікатыўнай і пошукавай функцый бібліяграфічнай інфармацыі.

Дзяржаўная бібліятэка БССР (з другой паловы 1992 г. — НББ) і Кніжная палата рэспублікі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, асабліва ў 60—70-я гады, імкнуліся знайсці аптымальны падыход да адбору дакументаў для універсальных дапаможнікаў. На нарадах па бібліяграфіі бібліяграфіі і ў працах вядомых бібліяграфазнаўцаў [17; 21; 22] былі выказаны думкі, што магчымы тэрытарыяльна-дзяржаўны і рэспубліказнаўчы падыходы да аб'ектаў уліку. Абодва прынцыпы знайшлі ўвасабленне ў бягучых і рэтраспектыўных крыніцах разглядаемай сістэмы.

Раней, чым было наладжана рэгулярнае інфармаванне аб новых бібліяграфічных матэрыялах, у Беларусі быў падрыхтаваны буйны рэтраспектыўны паказальнік "Бібліяграфія беларускай савецкай бібліяграфіі: 1922—1961 гг.", складзены бібліёграфамі ЦНБ імя Якуба Коласа АН Беларусі Л. І. Збралевіч і С. У. Фядулавай [4]. У паказальніку адлюстраваны 1935 бібліяграфічных матэрыялаў, выдадзеных на тэрыторы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэспублікі (незалежна ад мовы): неперыядычныя і перыядычныя асобна выдадзеныя дапаможнікі; прыкніжныя і прыартыкульныя спісы літаратуры; друкаваныя каталогі і спісы паступленняў у бібліятэкі. Галіновая групоўка бібліяграфічных запісаў (па схеме, якая выкарыстоўваецца ў маскоўскім штогодніку "Бібліяграфія савецкай бібліяграфіі") дазволіла раскрыць бібліяграфічную забяспечанасць розных навук, галін вытворчасці. У прадмове асветлены ўзнікненне і развіццё асобных відаў і галоўных галін бібліяграфічнай інфармацыі, названы самыя важныя бібліяграфічныя крыніцы. Складальнікі добра ўсведамлялі абагульняючую функцыю паказальніка, неабходнасць скарыстаць якасную адзнаку ў адборы матэрыялу. Таму яны кіраваліся намерам уключаць тое, што мае сваю навуковую і практычную каштоўнасць.

Працу па рэтраспектыўным уліку бібліяграфічных дапаможнікаў ЦНБ АНБ прадоўжыла сумесна з Дзяржаўнай бібліятэкай БССР. У 1980 г. яны выдалі паказальнік "Бібліяграфічныя дапаможнікі БССР: 1962—1973 гг.", складзены З. Г. Рачэк і З. А. Сядой [15]. У параўнанні з папярэднім выданнем быў зменены прынцып адбору: уключаліся выдадзеныя не толькі ў Беларусі (незалежна ад мовы), але і выдадзеныя па-за яе межамі беларусазнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы на рускай і ўкраінскай мовах. Пашырыўся склад бібліяграфічных матэрыялаў — за кошт адлюстравання такіх матэрыялаў, як спісы літаратуры ў падрадковых заўвагах, выдавецкія тэматычныя планы, паказальнікі зместу часопісаў.

Буйны тэарэтык і арганізатар бібліяграфічнай справы ў Беларусі І. Б. Сіманоўскі абгрунтаваў навуковую і практычную ролю ўліку бібліяграфічных матэрыялаў па рэспубліказнаўчай прыкмеце. Ён запланаваў серыю "Матэрыялы па беларускай бібліяграфіі", дзе павінны былі з'явіцца выпускі, якія б адлюстроўвалі рэспубліказнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі незалежна ад іх зместу і ад часу і месца іх выдання. Але выйшла ўсяго адна кніга з запланаванай серыі — манаграфія І. Б. Сіманоўскага "Беларуская савецкая бібліяграфія" з прыкніжным паказальнікам "Бібліяграфія беларускай савецкай бібліяграфіі" [17]. У паказальніку ўлічаны толькі рэспубліказнаўчыя універсальныя бібліяграфічныя дапаможнікі, што апублікаваны у 1922—1965 гг. Рэспубліказнаўчыя дапаможнікі, выдадзеныя да 1974 г., прыведзены ў паказальніку З. Г. Рачэк і З. А. Сядой "Бібліяграфічныя дапаможнікі БССР: 1962—1973 гг.". (У далейшым іх пачалі адлюстроўваць ў штогодніку "Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі".) На гэтым

РЭПАЗІТОРЫЙ.БДУКІ

выданне універсальных рэтраспектыўных паказальнікаў пакуль што спынілася. Бібліяграфічныя крыніцы акрамя таго можна знайсці ў вучэбных дапаможніках па бібліяграфічных дысцыплінах (гл., напр.: [10]).

Безумоўна, з сучасных пазіцый методыка бібліяграфавання, скарыстаная пры складанні дапаможнікаў, можа выклікаць пэўныя заўвагі ў адносінах групоўкі матэрыялаў і мовы анатавання. Аднак галоўнай застаецца праблема аднаўлення і развіцця гэтай падсістэмы. Неабходна стварэнне бібліяграфічнага дапаможніка, у якім былі б адлюстраваны бібліяграфічныя матэрыялы, звязаныя з Беларуссю па прадметна-этнічнай прыкмеце і выдадзеныя на яе тэрыторыі да 1922 г. (незалежна ад мовы). Трэба вырашыць пытанне аб працягу выдання рэтраспектыўных універсальных паказальнікаў бібліяграфічных дакументаў. Стабільнасць выпуску бягучых “Паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі”, на наш погляд, не здымае неабходнасці выдання універсальных рэтраспектыўных паказальнікаў за перыяд пасля 1973 г. Толькі ва універсальных рэтраспектыўных паказальніках магчыма абагульніць бібліяграфічную забяспечанасць асобных навук і галін вытворчасці, што ў аднолькавай ступені важна і для спажыўцоў, і для вытворцаў бібліяграфічнай інфармацыі.

Параўноўваючы вынікі працы беларускіх складальнікаў з нацыянальнымі паказальнікамі бібліяграфічных дапаможнікаў, створанымі ў іншых краінах, і з вядомымі міжнароднымі рэтраспектыўнымі паказальнікамі Ю. Петцхольда “Бібліяграфічная бібліятэка”, Г. Шнэйдэра “Кіраўніцтва па бібліяграфіі”, Т. Бестэрмена “Сусветная бібліяграфія бібліяграфій”, адзначым, што, на нашу думку, беларускія бібліёграфы наогул удала вырашылі галоўную метадычную праблему — забеспячэнне паўнаты ўліку бібліяграфічных матэрыялаў. З такога пункту гледжання мы тлумачым пашырэнне аб’ектаў ўліку — як па тэрытарыяльна-змястоўнай прыкмеце, так і па форме бібліяграфічных дапаможнікаў — у паказальніку З. Г. Рачэк і З. А. Сядой. Тэндэнцыю да пашыранай трактоўкі паняцця “бібліяграфія па той ці іншай краіне” адзначыў, даследуючы развіццё замежнай бібліяграфіі бібліяграфіі, К. Р. Сімон [18]. Мы мяркуем, што калі для забеспячэння паўнаты ўліку бібліяграфічных дапаможнікаў, выдадзеных ў рэспубліцы, ёсць пэўныя асновы, дык у адлюстраванні рэспубліказнаўчых матэрыялаў, якія выйшлі па-за межамі Беларусі, паўнату забяспечыць практычна немагчыма. Прасторавыя, моўныя і іншыя бар’еры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абумоўліваюць наяўнасць такой рысы, як пэўная "выпадковасць адбору".

Якое ж выйсце лічыць лепшым? Можа, адмовіцца ў будучых рэтраспектыўных паказальніках ад уключэння дапаможнікаў па змястоўна-тэрытарыяльнай прыкмеце? Нам думаецца, што такое рашэнне было б памылковым, не адпавядаючым агульнай тэндэнцыі развіцця дапаможнікаў дадзенага тыпу. Нават пры значнай долі "выпадковасці адбору" бібліёграфы галіновых і універсальных навуковых бібліятэк могуць атрымаць каштоўную інфармацыю аб бібліяграфічных дакументах, прысвечаных Беларусі. Карысць для бібліёграфаў-практыкаў, магчымасць скарыстаць той ці іншы бібліяграфічны матэрыял у даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні павінна быць галоўным крытэрыем пры вырашэнні пытання адбору дакументаў. Мы б раілі будучым складальнікам рэтраспектыўных універсальных паказальнікаў арыентавацца перш за ўсё на бібліёграфаў-практыкаў, а ўжо потым — на гісторыкаў бібліяграфіі, зацікаўленых у вычарпальнай паўнаце ўліку ў мэтах вывучэння тэндэнцый развіцця бібліяграфіі. Гэта наша меркаванне тычыцца галоўным чынам адбору беларусазнаўчых матэрыялаў, выдадзеных па-за межамі рэспублікі. Пры групоўцы матэрыялаў мэтазгодна раздзяляць бібліяграфічныя дапаможнікі, якія выйшлі ў свет у рэспубліцы і якія выйшлі за мяжой.

Рэтраспектыўнаму пошуку бібліяграфічных матэрыялаў, выпушчаных у свет у Беларусі, садзейнічаюць паказальнікі выданняў вядучых навуковых бібліятэк. Так, Рэспубліканская навукова-медыцынская бібліятэка (РНМБ) свае дапаможнікі ўключыла ў паказальнік "Рэспубліканская навукова-медыцынская бібліятэка Беларусі: 1940—1990 гг." (Мн., 1992; руская мова); Рэспубліканская навукова-метадычная бібліятэка па фізкультуры (РНМБФ) падрыхтавала паказальнік "Выданні Рэспубліканскай навукова-метадычнай бібліятэкі па фізічнай культуры" (Мн., 1987; руская мова). Гэтыя паказальнікі раскрываюць бібліяграфічную распрацаванасць медыцыны і фізічнай культуры ў рэспубліцы. Аналагічныя выданні эпізадычна рыхтуюць абласныя бібліятэкі, напрыклад Гомельская, якая выдала паказальнік, дзе адлюстравала ўласныя краязнаўчыя бібліяграфічныя выданні [24], Гродзенская і Магілёўская, якія выдалі паказальнікі, куды ўвайшлі ўласныя бібліяграфічныя выданні і выданні, прысвечаныя вобласці [16; 23]. Відавочна, што бібліятэкі як бібліяграфічныя цэнтры пастаянна адчуваюць патрэбу ў абагульненні выдавецкай бібліяграфічнай дзейнасці. Яны шука-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

юць аптымальныя формы гэтых паказальнікаў па функцыянальна-мэтавым і змястоўным прызначэнні.

Аналіз паказальнікаў выданняў бібліятэк сведчыць, што перад складальнікамі стаяць два пытанні, на якія дакладнага адказу яшчэ няма: рэгулярнасць выдання паказальнікаў і змястоўны падыход да адлюстравання бібліяграфічных матэрыялаў. Гаворачы аб першым пытанні, трэба адзначыць, што часцей за ўсё паказальнікі выдаюцца да юбілеяў гэтых бібліятэк. Думаецца, што трэба выдаваць рэтраспектыўныя працы са значным храналагічным ахопам. Другое пытанне тычыцца галоўным чынам бібліятэк, якія з'яўляюцца рэгіянальнымі цэнтрамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці. Яны зацікаўлены ў тым, каб адлюстроўваць не толькі ўласныя, але і іншыя бібліяграфічныя выданні аб рэгіёне. Дапаможнікі Гродзенскай і Магілёўскай абласных бібліятэк сведчаць аб гэтым.

У праекце "Палажэння аб краязнаўчай дзейнасці краявых і абласных універсальных навуковых бібліятэк", падрыхтаваным Дзяржаўнай публічнай бібліятэкай імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына (цяпер — Расійская нацыянальная бібліятэка) [12], як і ў некаторых раней распрацаваных мадэлях сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, выдзелены паказальнікі краязнаўчых бібліяграфічных матэрыялаў. Мы далучаемся да тых, хто прызнае неабходнасць развіцця абласнымі бібліятэкамі гэтага напрамку дзейнасці. Некаторы вопыт выпуску такіх паказальнікаў бібліятэкамі рэспублікі ўжо назапашаны, аб чым сведчаць такія выданні, як "Бібліяграфічныя дапаможнікі аб Магілёўшчыне" Х. Чарток [23], і інш. Аднак праблема поўнага ўліку бібліяграфічных матэрыялаў аб абласцях яшчэ чакае свайго вырашэння.

Улічваючы цяперашнія цяжкія ўмовы для выдавецкай дзейнасці, можна прапанаваць абласным універсальным бібліятэкам з асаблівай паўнатой весці адлюстраванне краязнаўчых бібліяграфічных матэрыялаў у краязнаўчых каталогах. Варта прымяняць даведачнае анатаванне, у тым ліку несамастойных бібліяграфічных форм.

Найбольш аператыўнае бягучае інфармаванне аб выдадзеных у рэспубліцы бібліяграфічных дапаможніках ажыццяўляе Нацыянальная кніжная палата Беларусі ў "Летапісе друку Беларусі". У "Кніжным летапісе" у рубрыцы "Бібліяграфія. Каталогі. Паказальнікі літаратуры" адлюстроўваюцца асобна выдадзеныя бібліяграфічныя дапаможнікі, спісы, тэматычныя планы выдання і г. д.

(Да 1992 г. бібліяграфічныя дакументы ўлічваліся ў рубрыцы "Бібліяграфія. Бібліяграфазнаўства".) Несамастойныя формы бібліяграфічных дапаможнікаў трэба шукаць у адпа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зедных галіновых раздзелах "Кніжнага летапісу" па бібліяграфічных запісах, у якіх даецца спасылка на наяўнасць бібліяграфічнага спісу літаратуры ў кнізе. Па штогодніках "Кнігі Беларусі", як і па раней выпушчаных у свет "пяцігодніках", таксама можна знайсці асобна выдадзеныя дапаможнікі і прыкніжныя спісы літаратуры — тым жа шляхам, што і па "Кніжным летапісе". Аналагічна ў "Летапісе часопісных артыкулаў" адлюстроўваюцца ўнутрычасопісныя спісы літаратуры і несамастойныя формы — прыартыкульныя спісы літаратуры.

Спецыялізаванае звяно паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў складае штогоднік Кніжнай палаты "Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі", які інфармуе аб выдадзеных у рэспубліцы бібліяграфічных дакументах розных відаў, форм і тыпаў. У ім адлюстроўваюцца звесткі аб асобна выдадзеных бібліяграфічных паказальніках; спісах; аглядах; бібліяграфічных перыядычных выданнях; ўнутрыкніжных і ўнутрычасопісных бібліяграфічных паказальніках; прыкніжных і прыартыкульных спісах літаратуры аб'ёмам не менш чым 15 назваў. Без колькаснага абмежавання ўключаюцца бібліяграфічныя спісы краязнаўчага характару.

Не ўключаюцца ў штогоднік даныя аб дапаможніках тыпу "Метадычныя і бібліяграфічныя матэрыялы"; спісах цытаванай літаратуры; спісах літаратуры, змешчаных у вучэбных праграмах і падручніках для агульнаадукацыйных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў; планах выдавецтваў; паказальніках зместу часопісаў за год і меншы перыяд часу; спасылках на літаратуру ў заўвагах. Аднак спасылкі на літаратуру ў заўвагах адлюстроўваюцца, калі гэта краязнаўчая літаратура аб асобах і ўстановах.

Штогоднік часткова анатаваны. У бібліяграфічным апісанні прыводзяцца звесткі аб відах, аб'ёме, храналагічных рамках і мове дакументаў, уключаных у бібліяграфічныя выданні. У штогодніку маюцца дапаможныя паказальнікі: імянны, загалоўкаў бібліяграфічных дапаможнікаў, калектываў складальнікаў, геаграфічны.

У штомесячным бюлетэні "Новыя кнігі Беларусі" ў канцы раздзела "Навінкі беларускага друку" пад рубрыкай "Да ўвагі бібліятэкараў" даюцца звесткі аб новых выданых у рэспубліцы бібліяграфічных паказальніках, метадычных матэрыялах, аглядах дзейнасці бібліятэк, паказальніках выданняў бібліятэк і г. д.

Арганізавана ў рэспубліцы інфармацыя і аб неапублікаваных бібліяграфічных спісах і картатэках. Звесткі пра гэта прыводзяцца ва універсальным "Паказальніку неа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публікаваных бібліяграфічных спісаў і картатэк, складзеных бібліятэкамі Беларусі ў... годзе". Яго рыхтуе і штогод выдае (з 1972 г.) НББ. Інфармацыя аб спісах і картатэках даецца на аснове звестак, атрыманых ад бібліятэк, і ўключае наступныя даныя: віды выданняў, адлюстраваных ў спісе, картатэцы; перыяд, за які прагледжаны бібліяграфічныя крыніцы; колькасць назваў выданняў у спісе, картатэцы; мовы, на якіх надрукаваны выданні; дата выканання бібліяграфічнага спісу, картатэкі; сіглы бібліятэк. Асобна даецца пералік бібліятэк, якія даслалі звесткі ў разглядаемы дапаможнік.

З 1986 г. Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка (РНТБ) выдае штогодны "Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў па найважнейшых рэспубліканскіх комплексных праблемах" (на рускай мове), дзе адлюстроўваюцца выкананыя бібліятэкай даведкі і апераджальныя спісы для спецыялістаў. Выдадзены "Спіс бібліяграфічных даведак і дапаможнікаў, выкананых Рэспубліканскай навукова-медыцынскай бібліятэкай у 1985—1987 гг." (Мн., 1988; руская мова).

Як бачым, у рэспубліцы намячаецца тэндэнцыя да дыферэнцыяцыі паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў па змястоўнай прыкмеце. Некаторыя бібліятэкі спрабуюць у адным выданні прадставіць звесткі аб апублікаваных і неапублікаваных бібліяграфічных дапаможніках.

Але пры ажыццяўленні гэтай работы ўзнікае шмат праблем. Па-першае, ў новых сацыяльна-эканамічных і інфармацыйных умовах патрэбна вырашыць арганізацыйныя пытанні. Неабходна вызначыць у рэспубліцы цэнтр, які б выконваў арганізацыйную, метадычную і каардынацыйную функцыі па падрыхтоўцы паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў. Безумоўна, такім цэнтрам павінна стаць НББ. Гэта агульная тэндэнцыя развіцця нацыянальных бібліятэк [20]. Г. Л. Левін, разглядаючы функцыі Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, пісаў, што нацыянальныя бібліятэкі павінны ўзяць на сябе задачу збору, захоўвання, распаўсюджвання звестак аб крыніцах другаснай інфармацыі — даведачных і інфармацыйных выданнях, каталогах і картатэках, базах і банках даных [6]. Сёння, у сувязі са знікненнем ранейшага ўсесаюзнага ўзроўню бібліятэк і органаў інфармацыі, патрэбна вызначэнне функцый галіновых навуковых бібліятэк у падрыхтоўцы паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў. У праекце "Палажэння аб узаемадзеянні бібліятэчна-бібліяграфічных устаноў Беларускай ССР у галіне бібліяграфічнай дзейнасці" перад бібліятэкамі як галоўнымі галіновымі навукова-метадычнымі цэнтрамі ставіцца задача стварэння па сваім профілі зводных картатэк

неапублікаваных бібліяграфічных спісаў і картатэк. Звесткі аб іх можна было б ці пасылаць ва універсальны рэспубліканскі паказальнік, ці, з улікам тэндэнцыі да дыферэнцыяцыі бібліяграфічнай інфармацыі, уключаць у галіновыя паказальнікі. Гэта дазволіла б узмацніць навукова-метадычную, кантрольную і каардынацыйную функцыі галіновых цэнтраў.

Па-другое, у спецыяльным друку ўжо неаднаразова адзначалася неабходнасць павышэння паўнаты адлюстравання неапублікаваных бібліяграфічных спісаў ва універсальным рэспубліканскім паказальніку. За 1991 г. звесткі аб разглядаемым відзе бібліяграфічнай прадукцыі прыслалі 20 бібліятэк Беларусі, у той час, калі толькі ў даведніку аб бібліяграфічных рэсурсах г. Мінска [1] зарэгістраваны звесткі аб 141 бібліятэцы. Трэба падтрымаць прапанову І. У. Мельнік аб пашырэнні аб'екта бібліяграфавання ў гэтых паказальніках за кошт апераджальных бібліяграфічных спісаў, тэматычных падборак, камулятыўных паказальнікаў матэрыялаў выбарчага распаўсюджвання інфармацыі [8].

Па-трэцяе, больш увагі патрэбна ўдзяляць метадычным пытанням выкарыстання неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў у рабоце бібліятэк. На цяперашні час усяго ў адным артыкуле разглядаецца выкарыстанне гэтай другаснай інфармацыі па грамадскіх навуках у даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні [3]. Метадычныя ж парады, рэклама дапаможніка, выкарыстанне гэтай інфармацыі ў працэсе навучання і павышэння кваліфікацыі бібліятэчна-бібліяграфічных кадраў дазволілі б актывізаваць іх запыты на неапублікаваную бібліяграфічную прадукцыю.

Актуальным з'яўляецца таксама пытанне аб аператыўнасці паказальнікаў, якія інфармуюць пра неапублікаваную бібліяграфічную прадукцыю. Інфармацыйны інтэрвал нават гадавой працягласці дрэнна ўплывае на актуальнасць гэтых спісаў для іншых бібліятэк.

Асобнае месца ў сістэме бібліяграфічнай інфармацыі аб бібліяграфічных дапаможніках займаюць паказальнікі, якія раскрываюць бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк. Дзяржаўная бібліятэка БССР у 1970 г. выдала запланаваны ў якасці штоквартальніка (але ён аказаўся адзіным) спіс "Новыя паступленні даведачных, бібліяграфічных і метадычных матэрыялаў у фонд бібліятэкі" (на рускай мове). Пазней намаганнямі гэтай жа бібліятэкі быў выданы штогоднік "Зводны каталог айчынных даведачна-бібліяграфічных выданняў, якія паступілі ў самыя буйныя бібліятэкі Беларусі" (штогоднік за 1972 г. выйшаў у 1974 г., мова — руская). На жаль, і гэта выданне не мела працягу [7, 218].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод бягучых крыніц, што адлюстроўваюць паступленні бібліяграфічных дапаможнікаў у фонды бібліятэк рэспублікі, інфармацыю аб замежных бібліяграфічных выданнях можна знайсці ў "Зводным каталогу новых замежных кніг, якія паступілі ў бібліятэкі Рэспублікі Беларусь". У гэтым штоквартальніку ёсць асобны раздзел — "Бібліяграфічныя дапаможнікі". Безумоўна, выкарыстоўваць гэты паказальнік было б лягчэй, калі б былі анатацыі ці хоць пераклады назваў на беларускую мову.

Зарубежныя бібліяграфічныя выданні перыядычнага характару адлюстроўваюцца ў "Зводным паказальніку замежных перыядычных выданняў, выпісаных бібліятэкамі БССР на... г." у частцы "Часопісы".

Пэўную работу ў рэспубліцы па раскрыцці сваіх фондаў бібліяграфічных выданняў праводзяць абласныя бібліятэкі. Мінская, Магілёўская і Віцебская бібліятэкі штоквартальна выдаюць універсальныя спісы метадычных і бібліяграфічных дапаможнікаў, якія паступілі ў адпаведныя бібліятэкі. У бібліяграфічным апісанні асобна выпушчаных выданняў звычайна прыводзіцца шыфр захавання іх у бібліятэцы, што дазваляе аператыўна знайсці патрэбнае выданне. У сукупнасці гэтыя выданні за год і больш працяглы час выконваюць функцыю раскрыцця бібліяграфічнай часткі даведачна-бібліяграфічнага фонду бібліятэкі.

Але такія выданні не могуць раскрыць поўна і комплексна бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк рэспублікі. Сёння праблема стварэння крыніц, якія б раскрывалі гэтыя рэсурсы ў бягучым аспекце, стала даволі актуальнай. Магчыма, гэта павінны быць зводныя каталогі.

Сярод рэтраспектыўных паказальнікаў, у якіх раскрываюцца бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк, трэба адзначыць выданні, што дапамагаюць арыентавацца ў такім важным відзе неапублікаванай бібліяграфічнай прадукцыі, як каталогі і картатэкі. Да іх адносяцца даведнікі, выданыя РНТБ, Цэнтральнай бібліятэкай імя Янкі Купалы г. Мінска, Урадавай бібліятэкай імя А. М. Горкага (цяпер — Прэзідэнцкая бібліятэка) [13; 14; 19].

Асобую ўвагу неабходна звярнуць на сумеснае выданне НББ і Цэнтральнай гарадской бібліятэкі Мінска "Бібліяграфічныя рэсурсы найбуйнейшых бібліятэк г. Мінска ў дапамогу абслугоўванню навукі, вытворчасці, адукацыі, культуры і мастацтва" [1]. Яно складзена дзеля садзейнічання эфектыўнаму выкарыстанню наяўных бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў і змяшчае звесткі аб формах бібліяграфічнага інфармавання, у тым ліку аб бягучых бібліяграфічных дапаможніках, "пашпартныя" даныя ката-

логаў і картатэк універсальных, галіновых і спецыяльных бібліятэк Мінска. Звесткі згрупаваны па галіновым прынцыпе, і па сутнасці кожны галіновы комплекс прадстаўляе сабой зводны даведачна-бібліяграфічны апарат (ДБА) акрэсленай галіны. Асобны раздзел — "Рэспубліказнаўства. Краязнаўства" — адлюстроўвае практыку вядзення тых ці іншых частак ДБА ў бібліятэках рэспублікі па тэрытарыяльным і прадметна-этнічным прынцыпах.

Гэты даведнік — вельмі каштоўны для практыкі. Ён садзейнічае каардынацыі дзейнасці бібліятэк па падрыхтоўцы бібліяграфічнай прадукцыі і выкарыстанню бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў, для задавальнення запытаў спажыўцоў інфармацыі. Даведнік адыгрывае станоўчую ролю пры планаванні бібліяграфічнай дзейнасці. Але не ўсе бягучыя бібліяграфічныя выданні адлюстраваны ў даведніку. Напрыклад, у раздзеле "Рэспубліказнаўства. Краязнаўства" не прыводзіцца такі найважнейшы універсальны паказальнік, як "Беларуская ССР у друку СССР і замежных краін" (зараз — "Беларусь у друку замежных краін"), які рыхтуецца галоўнымі рэспубліканскімі бібліятэкамі і Нацыянальнай кніжнай палатай. Акрамя таго, у даведніку шмат інфармацыі, што носіць часовы характар (напрыклад, аб формах бібліяграфічнага інфармавання).

Неабходнасць поўнага ўяўлення аб бібліяграфічных рэсурсах рэспублікі патрабуе стварэння крыніц бібліяграфічнай інфармацыі, якія б давалі звесткі пра бібліяграфічныя дапаможнікі, што выдадзены не толькі ў рэспубліцы і прысвечаны ёй па змесце (гэта задача нацыянальнай рэтраспектыўнай інфармацыі). У даведачна-бібліяграфічных фондах бібліятэк ёсць вялікая колькасць бібліяграфічных крыніц, выданых бібліятэкамі, бібліяграфічнымі ўстановамі і органамі НТІ краін блізкага і далёкага замежжа. Таму неабходна стварыць крыніцы, якія б раскрывалі і гэтыя бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк рэспублікі.

На наш погляд, у бібліятэкараў сёння карыстаюцца попытам дапаможнікі, што разам з бібліяграфічнай прадукцыяй адлюстроўваюць даведнікі — энцыклапедыі, тлумачальныя слоўнікі, біяграфічныя слоўнікі, даведнікі па галінах навукі, камерцыйныя даведнікі і г. д., але іх пакуль што недастаткова. У некаторых з іх прысутнічае бібліяграфічная інфармацыя, хаця яна і не выконвае асноўнай ролі па змесце. Сінтэз бібліяграфічных і даведачных матэрыялаў садзейнічае інтэнсіфікацыі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў бібліятэках.

Навукова-бібліяграфічны аддзел НББ плануе стварэнне банка даных "Нацыянальная бібліятэка Беларусі". Яго бу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дуць складаць тры базы: фактаграфічная (у тым ліку "Хроніка падзей"); выданні бібліятэкі; выданні аб бібліятэцы. Мяркуем, што ў будучым НББ магла б працягнуць гэтую работу і стварыць банк даных аб цэнтрах і крыніцах другаснай інфармацыі, якія маюцца ў нашай рэспубліцы і па-за яе межамі. У банк маглі б ўвайсці фактаграфічныя звесткі аб рэспубліканскіх і замежных бібліятэчна-бібліяграфічных і інфармацыйных цэнтрах, звесткі аб крыніцах другаснай інфармацыі — даведачных і інфармацыйных выданнях, каталогах і картатэках, базах і банках даных. Гэта дало б магчымасць стварыць такі даведачны апарат, які стаў бы ключом да даведачных і бібліяграфічных рэсурсаў і самой Беларусі, і іншых краін. На аснове банка даных бібліятэка рыхтавала б бібліяграфічныя работы рознага прызначэння, у тым ліку зводныя каталогі паступленняў даведачных і бібліяграфічных выданняў у бібліятэкі рэспублікі, што дазволіла б пазбегнуць рассейвання бібліяграфічнай інфармацыі аб бібліяграфічных рэсурсах.

Найстарэйшым тыпам дапаможніка па бібліяграфіі бібліяграфіі ў нашай краіне з'яўляюцца агляды бібліяграфічных дапаможнікаў. Яны рыхтуюцца за розныя адрэзкі часу. У рэспубліцы сістэматычна рыхтуюцца агляды бібліяграфічных дапаможнікаў па пэўных галінах ведаў і відах бібліяграфіі, якія друкуюцца ў штогодніку "Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў". Тыя агляды бібліяграфічных дапаможнікаў, якія рыхтуюцца каардынацыйным цэнтрам — навукова-бібліяграфічным аддзелам НББ, выдаюцца раз у пяць гадоў.

Агляды бібліяграфічных дапаможнікаў выконваюць розныя функцыі, напрыклад крыніцазнаўчую — па вывучэнні гісторыі бібліяграфіі. Яны могуць выконваць ацэначную функцыю, арыентуючую, педагагічную, прагнастычную. Аналіз аглядаў бібліяграфічных дапаможнікаў, якія друкуюцца ў штогодніку, сведчыць аб тым, што яны напісаны з розных метадычных пазіцый. Часцей за ўсё складальнікі рыхтуюць іх адначасова для розных катэгорый чытачоў: для бібліёграфаў-складальнікаў, для бібліятэкараў-бібліёграфаў, для чытачоў—спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі. Прычым у большасці аглядаў перавага аддаецца бібліёграфам-складальнікам: шмат увагі ўдзяляецца метадычным асаблівасцям, разгляду недахопаў бібліяграфічных дапаможнікаў і прапановам наконт таго, які падыход будзе метадычна больш правільным. У некаторых аглядах вызначаюцца напрамкі развіцця галіновай бібліяграфіі, робяцца прапановы арганізацыйнага характару.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, штогоднік "Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі" адносіцца да крыніц агульнай бібліяграфіі. Агляды бібліяграфічных дапаможнікаў, якія па сутнасці выконваюць функцыі ўступнага артыкула да штогодніка, павінны насіць крыніцазнаўчы, арыентуючы характар — даваць агульную характарыстыку выданых за год бібліяграфічных дапаможнікаў па пэўнай галіне ведаў, асобную характарыстыку больш значных для бібліяграфічнага забеспячэння галіны ведаў дапаможнікаў, раскрываць іх метадычныя, пошукавыя асаблівасці, звяртаць увагу карыстальнікаў на новыя з'явы ў галіновай бібліяграфіі, узнікненне новых відаў бібліяграфічных дапаможнікаў, бібліяграфічнае забеспячэнне новых актуальных тэм. Структура аглядаў павінна адпавядаць тэарэтычным поглядам на структуру рэспубліканскай сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі.

На жаль, з кожным годам усё меншая колькасць бібліяграфічных напрамкаў дзейнасці забяспечваецца штогадовымі аглядамі. Так, калі ў пачатку іх выдання (1981) у "Паказальніку бібліяграфічных дапаможнікаў" было надрукавана 10 аглядаў бібліяграфічных дапаможнікаў, то ў 1989 — 6, а ў 1990 г. — толькі 5 аглядаў. Пачынаючы з 1992 г. Нацыянальная кніжная палата змяшчае аглядныя артыкулы ў гэтым паказальніку не кожны год, а адзін раз у пяць гадоў.

Агляды ж бібліяграфічных дапаможнікаў, што рыхтуюцца на рэтраспектыўнай аснове за пяць гадоў і друкуюцца ў метадычных рэкамендацыях універсальным і галіновым навуковым бібліятэкам і адпаведна прызначаны для бібліёграфаў і бібліятэкараў, павінны мець больш ацэначны, метадычны і прагнастычны характар, напрыклад змяшчаць адказы на пытанні, наколькі складальніцкая праца бібліятэк за пяць гадоў адпавядала каардынацыйным планам, якія найбольш тыповыя метадычныя і арганізацыйныя недахопы выявіліся на падставе аналізу масіву бібліяграфічных дапаможнікаў, якія прапановы маюцца па іх удасканаленні, якія вызначаны лакуны ў бібліяграфічным забеспячэнні пэўных галін ведаў, якія бачацца напрамкі развіцця таго ці іншага віду бібліяграфіі. З дапамогай гэтых аглядаў павінна ажыццяўляцца рэгулюючая функцыя бібліяграфіі бібліяграфіі ў працэсе кіравання падрыхтоўкай бібліяграфічных дапаможнікаў у рэспубліцы.

У Беларусі зусім не развіты такі тып бібліяграфічных дапаможнікаў, як даведнікі ў дапамогу спажыўцам інфармацыі, падобныя на даведнік Е. Іеніш "Бібліяграфічны пошук у навуковай працы" [5]. Патрэбу навуковых супрацоўнікаў у такіх выданнях пацвярджаюць і вынікі навуковых даследа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванняў. Напрыклад, пры вывучэнні эфектыўнасці выкарыстання бібліяграфічных дапаможнікаў спажыўцамі супрацоўнікі Бібліятэкі Расійскай Акадэміі навук прыйшлі да вынікаў аб мэтазгоднасці стварэння такіх бібліяграфічных выданняў, якія сумяшчалі б у сабе і рысы паказальніка бібліяграфічных дапаможнікаў, і рысы бібліяграфічнага паказальніка літаратуры. У практыцы работы бібліятэкі іх называюць бібліяграфічнымі даведнікамі. Яшчэ іх называюць паказальнікамі "павышанай інфарматыўнасці" [11, 135—137].

Метадычна яны будуюцца па ўзоры шырока вядомых і ў нашай краіне, і за яе межамі даведнікаў. У даведнікі ўключаюцца бібліяграфічныя запісы аб бягучых і рэтраспектыўных паказальніках па тэме, друкаваных каталогах, паказальніках бібліяграфічных дапаможнікаў, рэфератыўных, даведачных выданнях, аглядах літаратуры, серыяльных выданнях, манаграфіях і найбольш значных артыкулах. Звесткі аб такім шырокім коле дакументаў значна павялічваюць магчымасці задавальнення запытаў спажыўцоў. У мэтах забеспячэння нагляднасці і хуткага пошуку неабходных матэрыялаў прымяняецца ўнутры змястоўных раздзелаў групоўка па відах выдання, распрацоўваецца цэлая сістэма дапаможных паказальнікаў. Інфармацыйнае значэнне ўключаных у дапаможнік крыніц раскрываецца з дапамогай анатацый. Раз у пяць гадоў даведнікі па пэўных тэмах перапрацоўваюцца і выдаюцца паўторна.

Актуальнай задачай з'яўляецца таксама ўлік баз даных. Сёння ён вядзецца толькі некаторымі бібліятэкамі, прычым эпізадычна, у асноўным праз рэкламныя буклеты. Неабходна вызначыць формы і парадак інфармавання аб гэтым відзе бібліяграфічнай прадукцыі. Выкарыстанне аўтаматызаваных сістэм, якія адлюстроўваюць базы даных, дазволіць весці пошук на ўзроўні не толькі бібліяграфічнага дапаможніка ў цэлым, але і яго раздзелаў, рубрык, аўтараў, г. зн. на аналітычным узроўні.

Такім чынам, сістэма інфармацыі аб бібліяграфічнай прадукцыі ў рэспубліцы з'яўляецца даволі разгорнутай, але патрабуецца яшчэ шмат намаганняў па яе ўдасканаленні.

1. Библиографические ресурсы крупнейших библиотек г. Минска в помощь обслуживанию науки, производства, образования, культуры и искусства / ГБЛ БССР, Минская ЦГБ им. Янки Купалы. Мн., 1990.

2. Гудовщикова И. В. О моделирующей функции библиографии второй степени // Теоретические проблемы библиографии второй степени / ГПБ. Л., 1975. Вып. 26.

3. Даниленко Л. И., Мельник И. В. Неопубликованные библиографические пособия библиотек по общественным наукам как средство справочно-

библиографического обслуживания // Методические рекомендации универсальным и отраслевым научным библиотекам Белоруссии / ГБЛ БССР. Мн., 1987.

4. Збралевич Л. И., Федулова С. В. Библиография белорусской советской библиографии: 1922—1961 гг. Мн., 1963.

5. Иениш Е. В. Библиографический поиск в научной работе: Справоч. пособие-путеводитель. М., 1982.

6. Левин Г. Л. Библиографическая деятельность Российской государственной библиотеки в новых условиях // Сов. библиотековедение. 1992. № 2.

7. Лявончыкаў В. Е. Беларуская бібліяграфія: Агульны курс: Падручнік. Мн., 1991.

8. Мельник И. В. Вопросы функционирования неопубликованной библиографической продукции по экономике в условиях союзной республики (на примере БССР) // Вопросы библиографоведения и библиотековедения. Мн., 1989. Вып. 10.

9. Муравьева А. В. Межведомственное взаимодействие библиотек как фактор интенсификации подготовки и использования источников библиографической информации в республике // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі "Беларуская бібліяграфія як частка нацыянальнай культуры". Мн., 1991.

10. Отраслевые библиографии БССР / Под общ. ред. В. А. Фокеева, Н. В. Иванова. Мн., 1979.

11. Петровская М. В., Леликова Н. К. Эффективность библиографических пособий (из опыта работы Библиотеки Академии наук СССР) // Повышение эффективности библиографической деятельности библиотек в условиях перестройки. М., 1990.

12. Положение о краеведческой деятельности краевых и областных универсальных научных библиотек // Вопросы теории и методики краеведческой библиографии и подготовки библиографических пособий в РСФСР. Л., 1991. Вып. 2.

13. Путеводитель по библиотекам Минской ЦБС. Мн., 1989.

14. Путеводитель по каталогам и картотекам РНТБ при БелНИИНТИ Госплана БССР. Мн., 1987.

15. Рачек З. Г., Седая З. А. Библиографические пособия БССР: 1962—1973 гг.: Указатель. Мн., 1980.

16. Ригилевич Г. М. Библиографические пособия о Гродненщине. Гродно, 1973.

17. Симановский И. Б. Белорусская советская библиография. Мн., 1965.

18. Симон К. Р. История иностранной библиографии. М., 1963.

19. Справочно-библиографический аппарат Правительственной библиотеки им. А. М. Горького. Мн., 1987.

20. Тюлина Н. И. Национальная библиотека: Опыт типолог. анализа. Мн., 1988.

21. Фролова И. И. Библиография библиографии в СССР: Состояние и перспективы развития // Сов. библиогр. 1986. № 6.

22. Фролова И. И. Всесоюзный семинар-практикум по библиографии // Сов. библиогр. 1986. № 5.

23. Черток Х. Библиографические пособия о Могилевщине: Указатель. Могилев, 1972.

24. Шатная А. Краеведческая библиография Гомельской областной библиотеки. Гомель, 1975.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ